**2005 год**

**Пятчыц, А. Зэльвенскі кірмаш – гонар наш/ А.Пятчыс // Беларуская думка. - № 2.- 2005. – с. 138 – 140.**

Гэтыя мясціны вядомы з эпохі войнаў паміж князямі Данілам Галіцкім і Войшалкам. У старажытнай хроніцы прыпамінаецца, што войска Данілы Галіцкага шукала ворага на беразе Зэльвы (так называлася да XIX ст. Зальвянка).
На працягу стагоддзяў Зэльвай валодалі розныя гаспадары. Амаль заўсёды яна пераходзіла ад адных другім мірна, часцей – у якасці закладу. Магчыма таму, што ніхто з гаспадароў тут не затрымліваўся, яны не звярталі вялікай ўвагі на развіццё Зэльвы.

Зорны час настаў толькі ў першай палове XVIII ст., калі Аляксандр Сапега, сапраўдны дабрадзей горада, сур'ёзна заняўся развіццём Зэльвы. І вынік ягонай працы можа быць добрым узорам таго, чаго магчыма дасягнуць у сферы эканомікі пры разумным кіраванні.

Аляксандр Сапега сур'ёна ўзяўся за развіццё горада, паклаўшы ў аснову яго дабрабыту стварэнне Зэльвенскага кірмашу.

Вынікі яго крапатлівай і, галоўнае, разумнай дзейнасці праявіліся хутка. Найбольшага росквіту зэльвенскі гандаль дасягнуў у другой палове таго ж стагоддзя. Тавараабарот кірмашу дасягаў астранамічнай сумы – некалькі мільёнаў злотых. Наязджалі сюды для забаў багацеі і авантурысты з усіх краін Еўропы, прыходзілі са славутай Смаргонскай акадэміі дрэсіроўшчыкі са сваімі мядзведзямі-танцорамі, цыганы і іншы люд, не выключаючы, безумоўна, і рознага кшталту зладзеяў.

Буйныя памеры Зэльвенскага кірмашу не маглі не паўплываць на эканамічнае развіццё ўсяго рэгіёна. Невыпадкова вялікі гетман літоўскі Міхаіл Казімір Агінскі (вядомы мецэнат, драматург, кампазітар, уладальнік суседняга Слоніма) пачаў пракладаць вядомы канал свайго імя, які злучыў Ясельду са Шчарай і тым самым Нёман Балтыйскага басейна звязаў з Прыпяццю, што ўпадае ў ў Чорнае мора. Гэта не толькі аблегчыла дастаўку тавараў з Еўропы і міжземнаморскіх гарадоў, але і дало магчымасць адкрыць ў Слоніме буйныя аптовыя склады, наладзіць інфраструктуру для прыёму купцоў і адпраўкі іх з таварамі ў Зэльву і ладзіць уласныя кірмашы. Пасля падзелу Рэчы Паспалітай, калі Зэльва ў ліку іншых беларускіх гарадоў адышла да Расійскай імперыі, кірмаш адразу пачаў занепадаць, бо новыя гаспадары ўвялі непамерныя падаткі.

Развіццё і багацце кірмашу адбілася і на архітэктурным вобліку Зэльвы. Акрамя старажытнага касцёла ў XVIII ст. была пабудавана прыгожая грэка-каталіцкая царква, пазней пераробленая на праваслаўную, і адна з багацейшых у гэтым рэгіёне сінагога. Школа айцоў-піяраў у Зэльве мела даволі высокі ўзровень. Там, сярод іншага, выкладалі лаціну, рыторыку і

паэтыку. Але ў XIX ст. піяраў прагналі, а школу падпарадкавалі так званай Адукацыйнай камісіі, і яна адразуператварылася ў звычайную местачковую пачатковую. Вось так скончыўся ўзлёт Зэльвы.